**Список литературы**

1. Доўгаль, Дз. Вучымся пісаць водгук. Спроба алгарытмізацыі творчага працэсу / Дз. Доўгаль // Роднае слова. — 2008. — С. 88–93.

2. Русский язык и литература. 9–11 классы : олимпиады / Е.Е. Долбик [и др.]. — Минск: Аверсэв, 2021. — 207 с.

3. Статуева, В.В., Григорук, Э.В. Организация исследовательской деятельности как эффективное средство развития познавательной активности учащихся / В.В. Статуева, Э.В. Григорук // Русский язык и литература. — 2024. — №5. — С. 13–18.

*Дата поступления в редакцию: 17.05.2024*

# ТВОРЧЫЯ ТЭКСТАВЫЯ ПРАКТЫКАВАННІ Ў СІСТЭМЕ ПАДРЫХТОЎКІ ДА ЛІНГВІСТЫЧНАГА ЭТАПУ ПРАДМЕТНАЙ АЛІМПІЯДЫ ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ І ЛІТАРАТУРЫ

*Мартынкевіч Святлана Васільеўна*

***Анатацыя.*** *У артыкуле разглядаюцца асаблівасці падрыхтоўкі вучняў да ўдзелу ў лінгвістычных конкурсах і прадметнай алімпіядзе па беларускай мове і літаратуры. Вызначаны комплекс тэкставых уменняў вучняў у адпаведнасці з кампетэнтнаснай асновай працэсу навучання беларускай мове. Прапанаваны практыкаванні з сістэмай творчых заданняў на аснове тэкстаў, у тым ліку і аўтэнтычных.*

Адзнакай сучаснага этапу развіцця адукацыі з'яўляецца актывізацыя ўвагі да высокаматываваных і адораных навучэнцаў. Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб адукацыі замацаваў прынцып інклюзіі, які ў кантэксце "ўліку разнастайнасці асаблівых індывідуальных патрэб" [2, с. 5] вызначае выяўленне і падтрымку адораных, таленавітых навучэнцаў. Сістэма працы з адоранымі вучнямі накіравана на падрыхтоўку да прадметных алімпіяд і творчых інтэлектуальных конкурсаў, спалучаючы ў сабе як традыцыйныя формы работы, так і магчымасці інавацыйных адукацыйных тэхналогій.

Удзел у лінгвістычных конкурсах і алімпіядах па беларускай мове і літаратуры патрабуе сфарміраванасці належнага ўзроўню заяўленых адукацыйным стандартам прадметных кампетэнцый вучняў.

Моўная кампетэнцыя вучняў, веды пра сістэму мовы на ўсіх яе ўзроўнях — фанетычным, лексічным граматычным, валоданне нормамі літаратурнай мовы, моўныя ўменні забяспечваюць гатоўнасць працаваць з заданнямі творчага характару. Варта адзначыць, што ў змест алімпіяд уключаны пераважна спецыфічныя лінгвістычныя практыкаванні, якія прадстаўляюцца ў выглядзе лінгвістычных задач. Назіранне і аналіз — разгляд тэксту "пад лінгвістычным мікраскопам" (М.М. Шанскі) — дапамагае ўсвядоміць функцыянальны аспект моўных з'яў, што неабходна для выканання заданняў лінгвістычнага конкурсу.

Сфарміраваны ў вучняў належны ўзровень лінгвакультуралагічнай кампетэнцыі спрыяе іх разуменню інфармацыі культуразнаўчага характару. Этнаграфічныя і бытавыя краіназнаўчыя рэаліі прэзентуюцца праз гістарызмы, этнаграфізмы, архаізмы, уключэнне ў тэксты лексічных адзінак, якія называюць прадметы побыту, ежы, напояў беларусаў. Устойлівыя адзінкі мовы – фразеалагізмы, парэміі, прэцэдэнтныя выразы — выяўляюць агульначалавечыя каштоўнасці, ідэалы, традыцыі, звычаі народа. Далучэнне вучняў да каштоўнасцей нацыянальнай культуры адбываецца, перш за ўсё, пры ўключэнні ў змест навучання культуразнаўчых тэкстаў, што адлюстроўваюць ментальны вопыт, культурныя асаблівасці беларускага народа. На аснове такіх тэкстаў адбываецца азнаямленне з культурным вопытам народа, этычнае і эстэтычнае ўздзеянне на думкі, пачуцці і паводзіны вучняў. Выкарыстанне інфармацыі пра традыцыйныя гаспадарчыя заняткі беларусаў, народнае жыллё, адзенне, кухню, сямейную і каляндарную абраднасць, народную музыку стварае ўмовы для асэнсавання вучнямі самабытнасці, эстэтычнай каштоўнасці традыцыйнай матэрыяльнай і духоўнай культуры беларускага народа.

Асобнае месца займаюць практыкаванні, распрацаваныя на аснове тэкстаў, якія накіраваны на спасціжэнне каштоўнасцей рэгіянальнай культуры. Праца з імі дае магчымасць вучням пазнаёміцца з дзейнасцю выбітных землякоў з малой радзімы, гісторыяй роднага краю. Краіназнаўчая інфармацыя такога роду паспрыяе выхаванню патрыятычных пачуццяў, павагі да малой радзімы і ўсёй Беларусі.

Інфармацыя пра факты грамадскага жыцця рэпрэзентуецца ў анамастычных адзінках: тапонімах, антрапонімах, назвах гандлёвых марак прадукцыі, рэкламных назвах. Таму ўменні працаваць з такім моўным матэрыялам (сацыякультурная кампетэнцыя) неабходна сістэмна развіваць і ўдасканальваць на этапе падрыхтоўкі да ўдзелу ў лінгвістычных конкурсах і алімпіядах.

Тэкст як асноўны дыдактычны сродак служыць базай для фарміравання лінгвістычнай, камунікатыўнай, лінгвакультуралагічнай і сацыякультурнай кампетэнцый, стымулюе спараджэнне выказванняў вучняў, ак-

тывізуе маўленча-мысліцельную дзейнасць вучняў, стварае матывацыю да пошуку новай інфармацыі. Тэкстацэнтрычны падыход як найбольш эфектыўны для распрацоўкі сістэмы творчых практыкаванняў арыентуе настаўніка на выкарыстанне тэкстаў "новай прыроды", якія "ўяўляюць сабой сінтэз мультымедыйных і вербальных кампанентаў, актыўна выкарыстоўваюць інфаграфіку, дапоўненую рэальнасць і іншыя магчымасці камунікацыі" [1, с. 114].

Прапануем комплекс тэкставых уменняў вучняў, якія неабходна фарміраваць у працэсе працы з разнастайнымі тэкстамі для якаснай лінгвістычнай падрыхтоўкі навучэнцаў да ўдзелу ў прадметных алімпіядах:

— выконваць заданні на трансфармацыю тэкстаў розных стыляў і жанраў;

— выконваць дзеянні з тэкставым матэрыялам — вызначаць ключавыя словы і словазлучэнні, апорныя сказы, тэматычна групаваць словы і інш.;

— праяўляць крэатыўнасць у працэсе працы з незнаёмай, зменненай інфамацыяй;

— асэнсоўваць, пераўтвараць, прымяняць інфармацыю як вербальную, так і невербальную, кампенсуючы недахоп інфармацыі ў прапанаваным тэксце;

— інтэграваць паведамленні з розных крыніц;

— творча апрацоўваць і крытычна ацэньваць інфармацыю, выконваючы логіка-сэнсавыя дзеянні (аналіз, параўнанне, класіфікацыя, абагульненне і інш.);

—ставіць і вырашаць камунікатыўныя задачы (апісваць, пераконваць, даказваць, тлумачыць), выкарыстоўваючы інфармацыю з прапанаванага тэксту;

— перакладаць тэкст з рускай мовы на беларускую;

— разумець інфармацыю і трансфармаваць аўтэнтычныя тэксты і інш.

Разгледзім некаторыя практыкаванні, распрацаваныя на аснове тэкстаў, у тым ліку і новага фармату, якія могуць быць выкарыстаны настаўнікамі ў працэсе падрыхтоўкі вучняў да лінгвістычных конкурсаў, прадметных алімпіяд па беларускай мове і літаратуры.

<u>I. Практыкаванні, распрацаваныя на аснове аўтарскіх тэкстаў, твораў мастацкай літаратуры.</u>

1. Прачытайце тэкст.

*У кожнага чалавека, які меў шчасце некалі нарадзіцца на нашай зялёнай — такой маленькай і такой неабдымнай — зямлі, абавязкова ёсць свой гожы, непаўторны і шчымліва-ласкавы край. Ён у вялікім і шырокім паняцці Радзімы звычайна займае невялікае, звыклае месца. Такі край — заўсёды твой цэлы свет.*

*Ёсць такі край і ў мяне. (Паводле Я. Сіпакова).*

1) выпішыце ў кожны слупок табліцы па чатыры словы, у якіх:

| Гукаў больш, чым літар | Літар больш, чым гукаў |
|---|---|
| | |

2) знайдзіце і выпішыце тры прыметнікі з прыстаўкай **не-**. Растлумачце правапіс прыстаўкі;

| Прыметнік | Тлумачэнне |
|---|---|
| | |
| | |
| | |

3) зрабіце транскрыпцыю апошняга сказа;

4) найдзіце і запішыце сказ, у якім дзейнік і выказнік выражаны назоўнікамі;

5) выпішыце прыклады слоў сінонімаў, антонімаў, амонімаў, якія сустракаюцца ў тэксце;

| | |
|---|---|
| **Сінонімы** | |
| **Антонімы** | |
| **Амонімы** | |

6) растлумачце лексічнае значэнне слова *гожы*;

7) выпішыце з тэксту словазлучэнні, якія адлюстроўваюць спецыфічныя рысы беларускай мовы на сінтаксічным узроўні і адпавядаюць наступным схемам:

| | |
|---|---|
| **Назоўнік + прыметнік** | |
| **Назоўнік + дзеепрыметнік** | |
| **Дзеяслоў + назоўнік** | |

8) знайдзіце ў 2-м сказе слова, марфемны склад якога адпавядае схеме: *прыстаўка — корань — суфікс-суфікс — суфікс*. Запішыце гэтае слова і назавіце, да якой часціны мовы яно адносіцца;

9) вызначце і запішыце тэму тэксту;

10) стварыце працяг тэксту – уласнае выказванне *"Мой гожы, ласкавы і шчымліва-непаўторны край"*.

2. Прачытайце тэкст.

*Свет матулі. Ён бясконцы, ён таямнічы. Ён з намі да апошняга ўздыху. Наша свядомасць, наша радасць і туга, наша спадчына. Ты вырас, ты самастойны, як здаецца табе. Кольк ўрачоў ні будуць абслухваць цябе, але ніколі ніхто з іх, ніводзін з іх з такой дакладнасцю не вызначыць ні тэмпературы тваёй, ні пульсу твайго, ні біцця сэрца, як маці твая зробіць гэта ў імгненне. Толькі прыкладзе руку сваю да твайго лба. Толькі прыхіліцца да цябе. Толькі прытуліцца да грудзей тваіх. (Паводле Рыгора Барадуліна).*

1) выпішыце ў кожны слупок табліцы па два словы, у якіх:

| Гукаў больш, чым літар | Літар больш, чым гукаў |
|---|---|
| | |
| | |

2) знайдзіце і запішыце тры прыметнікі з прыстаўкай **ні-**. Растлумачце правапіс прыстаўкі;

| Прыметнік | Тлумачэнне |
|---|---|
| | |
| | |
| | |

3) зрабіце транскрыпцыю апошняга сказа;

4) знайдзіце і запішыце спалучэнне слоў, у якім часціца *ні* ўжываецца са значэннем сцвярджэння;

5) выпішыце прыклады слоў сінонімаў, антонімаў,

амонімаў, якія сустракаюцца ў тэксце;

| | |
|---|---|
| **Сінонімы** | |
| **Антонімы** | |
| **Амонімы** | |

6) растлумачце лексічнае значэнне слова *спадчына*;

7) выпішыце з тэксту словазлучэнні, якія адлюстроўваюць спецыфічныя рысы беларускай мовы і адпавядаюць наступным схемам;

| | |
|---|---|
| **Дзеяслоў + займеннік у форме роднага склону** | |
| **Дзеяслоў + займеннік у форме давальнага склану** | |
| **Дзеяслоў + назоўнік з прыназоўнікам** | |

8) знайдзіце сказ і запішыце складаны сказ з дзвюма неразвітымі часткамі;

9) вызначце і запішыце тэму тэксту;

10) стварыце працяг тэксту — уласнае выказванне пра *"Свет матулі бясконцы"*.

<u>II. Практыкаванні, распрацаваныя на аснове аўтэнтычных тэкстаў.</u>

1. Прачытайце урывак з прадмовы Францыска Скарыны.

*... Въ розмаитыхъ речахъ люди на свете покладают мысли и кохания своя. Едины в царствахъ и в пановании. Друзии в богатестве и въ скарбохъ. Инии в мудрости и в науце. А инии въ здравии, в красоте и въ крѣпости телеснои. Нецин же во множестве имения и статку. А нецин в роскошном ядении и питии. И инии теже въ детех, въ приятелехъ, во слугахъ и во иных различныхъ многых речахъ. А тако единыи каждыи человѣкъ имет некоторую речь предъ собою, в неи же ся наболеи кохает и о неи мыслит.*

1) запішыце асноўную думку тэксту;

2) успомніце і запішыце прыказку/прымаўку, якая адпавядае асноўнай думцы тэксту;

3) знайдзіце і запішыце прыклады слоў, якія адлюстравалі лексічныя, фанетычныя і граматычныя асаблівасці жывой беларускай мовы таго часу (па адным прыкладзе на кожную з'яву);

4) у якім значэнні ўжыта слова (въ розмаитыхъ) речахъ у прадмове Францыска Скарыны? Запішыце значэнне слова.

5) у якім значэнні ўжываецца гэта слова ў сучаснай беларускай мове? У рускай мове? Складзіце і запішыце слоўнікавыя артыкулы да слоў.

6) успомніце і запішыце, як называецца лексічная з'ява, прадэманстраваная ў папярэднім адказе;

7) запішыце тры прыклады міжмоўных амонімаў. Складзіце з імі словазлучэнні так, каб у іх выяўлялася лексічнае значэнне слоў-амонімаў.

2. Прачытайце тэкст — урывак з газетнай нататкі.

*22 ліпеня 2025 года будзе адзначацца 130-годдзе з дня нараджэння савецкага авіяканструктара, двойчы Героя Сацыялістычнай Працы, лаўрэата Ленінскай і Дзяржаўных прэмій, ураджэнца Глыбокага – Паўла Восіпавіча Сухога.*

*Імя гэтага выдатнага савецкага канструктара авіяцыйнай тэхнікі сёння вядома ва ўсім свеце. Самалёты з маркай "Су" займаюць вартае месца ў гісторыі айчыннага і сусветнага самалётабудавання. Пад кіраўніцтвам П.В. Сухога было спраектавана больш за пяцьдзясят арыгінальных канструкцый, пабудавана больш за чатыры дзясяткі тыпаў самалётаў.*

*Іменем П.В. Сухога названы вуліцы ў Маскве і ў Віцебску. У Гомелі ўстноўлены помнік П.В. Сухому, яго імя прысвоена Гомельскаму дзяржаўнаму тэхнічнаму ўніверсітэту. Устаноўлены мемарыяльныя дошкі ў Маскве і Гомелі. (Паводле А. Жыгунова).*

1) складзіце слоўнік спецыяльных слоў і выразаў на аснове зместу тэксту. Дайце лінгвістычны каментарый мэтазгоднасці іх ужывання ў тэксце;

2) Якім чынам увекавечана імя П.В. Сухога ў Глыбокім?

3) Якія яшчэ выбітныя асобы Глыбоччыны вам вядомыя? Устанавіце правільную адпаведнасць паміж прозвішчам у першым слупку табліцы і інфармацыяй, прыведзенай у другім слупку;

| | |
|---|---|
| *Ігнат Буйніцкі* | *беларускі мастак, скульптар* |
| *Тадэвуш Даленга-Мастовіч* | *пісьменнік* |
| *Язэп Драздовіч* | *грамадска-палітычны дзеяч, філолаг, пісьменнік, літаратуразнавец* |
| *Вацлаў Ластоўскі* | *тэатральны дзеяч* |

4) падрыхтуйце тэкст нататкі для газеты пра аднаго з культурных дзеячаў, прозвішча якога прыведзена ў табліцы, выкарыстоўваючы інфармацыю з інтэрнэт-крыніц.

3. Разгледзьце афішу (малюнак 1).

1) перакладзіце інфармацыю, змешчаную на




Малюнак 1

афішы, на беларускую мову;

2) складзіце тэкст для рэкламы выставы на аснове інфармацыі з афішы;

3) запішыце тэкст аб'явы на аснове прапанаванай інфармацыі.

4. Праслухайце медыятэкст.

1) знайдзіце ў тэксце аднакаранёвыя словы, запішыце рад аднакарнёвых слоў;

2) дакажыце графічна, што выпісаныя словы ўтвараюць словаўтваральны ланцужок;

3) вызначце і запішыце назву фанетычнай з'явы, якая адбываецца ў корані пры ўтварэнні новых слоў;

4) расшыфруйце сказ, аднавіце графічныя абрысы слоў у сказе, падбярыце іншыя ўстойлівыя выразы з такім значэннем;

*[ЧЫМКАЗАЦ'/ЛЕПШПАСМАКАВАЦ']*

5) складзіце і запішыце тэкст рэкламы "Беларускі пламбір" (малюнак 2).




Малюнак 2

<u>III. Практыкаванні, распрацаваныя на аснове тэкстаў лінгвакультуралагічнага зместу.</u>

1. Прачытайце тэкст.

*Слово «календарь» восходит к латинскому «calendae» (первый день месяца), а оно, в свою очередь, — к глаголу «Calare», что означает «выкликать»: в Древнем Риме обязанностью главного жреца было громкое провозглашение первого дня нового месяца.*

*Вообще же календари создавались независимо от Древнего Рима, задолго до и после него в разных уголках Земли, ибо потребность измерять время возникла у всех народов, как только осознавалась периодичность явлений природы (смена дня и ночи, времени года). Нет нужды доказывать, что упорядоченный счет времени, с одной стороны, — итог длительного развития человеческой мысли, наблюдений и опыта, с другой — необходимое условие дальнейшего развития цивилизации. Славяне не были исключением. Им тоже пришлось осваивать способы времяисчисления, вырабатывать свой календарь с очень крупными и достаточно мелкими единицами — от понятий «век», «эпоха» до обозначения частей суток (день, ночь, сумерки и пр.).*

*Исстари основным занятием восточных славян было земледелие, поэтому культура в целом и основная масса праздников, обрядов носила земледельческий характер. Календарь крестьянина представлял собой сложное явление, включающее в себя знание природы, осмысление закономерностей человеческой жизни, сельскохозяйственный опыт, обряды, произведения устного народного творчества, установившиеся веками нормы общественной жизни и многое другое. Это своеобразный дневник и энциклопедия крестьянского быта с его праздниками и буднями. (А.Ф. Некрылова).*

1) выберыце інфамацыю пра паходжанне слова каляндар, прапануйце звесткі ў выглядзе этымалагічнай даведкі да слова;

2) колькі значэнняў мае слова каляндар? Стварыце слоўнікавы артыкул да слова каляндар;

3) знайдзіце інфармацыю пра тое, як славяне лічылі час, падрыхтуйце паведамленне на аснове тэксту пра гісторыю стварэння календара ва ўсходніх славян.

2. Прачытайце тэкст.

*Расказваюць карані слоў*

*Вывучэнне каранёў слоў — гэта навука, якая датычыць не толькі мовы, але і гісторыі пэўнага народа, яго духоўнага свету, мыслення і разумення свайго існавання на зямлі.*

*Самымі старадаўнімі словамі, напэўна, можна лічыць тыя, якія сведчаць пра выжыванне людзей у глыбокую даўніну. Зразумела, што гэтыя словы былі звязаны са здабываннем ежы, а найперш, напэўна, з паляваннем. Мяне зацікавіла, чаму ў гэтым слове корань "пал"? Як вядома, у полі водзіцца мала звяроў. І тады сам сабою прыйшоў лагічны адказ. Слова ўтварылася тады, калі нашы продкі жылі недзе ў стэпе, займаліся збіральніцтвам, хадзілі ў поле, каб знайсці ядомыя зёлкі, зерне, карані. А гэткае збіральніцтва на полі сталі называць паляваннем, значна пазней яно стала ўжывацца ў тым сэнсе, у якім мы разумеем яго цяпер. Ежа, якую гатавалі з травы, атрымала назву "страва". Ад гэтага слова ў сваю чаргу ўтварылася і слова "страўнік". (З. Дудзюк).*

1) вызначце тэму тэксту;

2) дакажыце, што "вывучэнне каранёў слоў... датычыць не толькі мовы, але і гісторыі пэўнага народа, яго духоўнага свету, мыслення і разумення свайго існавання на зямлі";

3) вызначце, які корань мае слова паляванне ў сучаснай беларускай мове;

4) чаму раней паляванне без агнястрэльнай і халоднай зброі называлі ловамі ?

5) перакладзіце слова паляванне на рускую мову і паразважайце над паходжаннем рускага адпаведніка;

6) складзіце выказванне на тэму "Расказваюць карані слоў", паклаўшы ў аснову аповеду інфармацыю пра паходжанне слова страўнік.

3. Прачытайце тэкст.

*Славянская сімволіка*

*Вада сімвалізуе ў славян жанчыну, жаночы род (адсюль русалкі — жыхаркі падводнага свету). Яблыня (яблынька!) — сімвал добрага, бо дае прыгожыя, смачныя, карысныя плады. Бяроза — сімвал звычайнага, радавога, працавітага, бо ўсе асноўныя вырабы ў гаспадарцы (бочкі, аглоблі, дугі, сані і інш.) з бярозы. Асіна — сімвал дрэннага, няцвёрдага, нямоцнага, хісткага, падатлівага, ненадзейнага. Змяя, аса, крапіва — сімвалы злосці, аб'яднаныя агульнай знешняй прыметай — "усе яны джаляць".*

*Соль — сімвал багацця ва ўсіх славян, сімвал асаблівага шанавання (адсюль хлеб-соль як каштоўны, ганаровы дар, а рассыпаць соль — значыць наклікаць гора, няшчасце). (Паводле В. Пахлёбкіна).*

1) знайдзіце ў тэксце лінгвакультуразнаўчую інфармацыю;

2) запоўніце табліцу: культурна афарбаваныя моўныя адзінкі, іх значэнне, суадносны ім сімвал;

| Культурна афарбаваныя моўныя адзінкі | Значэнне | Сімвал |
|---|---|---|
| | | |

3) прывядзіце ўласныя прыклады беларускіх культурных сімвалаў (жывёл, птушак, кветак) і раскрыйце іх вобразны сэнс, спасылаючыся на моўныя факты. Дапоўніце імі табліцу.

Такім чынам, падрыхтоўка вучняў да ўдзелу ў лінгвістычных конкурсах, прыдметных алімпіядах – працэс працяглы, працаёмкі, але неабходны з пункту гледжання далучэння навучэнцаў да навуковага пошуку. У працэсе такой працы адбываецца развіццё ўменняў працаваць з рознымі інфармацыйнымі крыніцамі, засваенне новых звестак, фарміраванне больш усвядомленага стаўлення да вучобы, самастойнасці ў набыцці ведаў, самаадукацыі і далейшай пасяпховай самарэалізацыі.

### Спіс літаратуры

1. Васюковіч, Л.С. Праца з тэкстам як аснова фаміравання функцыянальнай пісьменнасці вучняў : манаграфія / Л.С. Васюковіч. — Віцебск, ВДУ імя П.М. Машэрава, 2024. — 177 с.

2. Кодекс Республики Беларусь об образовании. – [Электронный ресурс]. — Режим доступа: https://pravo.by/document/. — Дата доступа: 12.05.2024.

3. Коршакова, Ю.В. Система отбора и подготовки одаренных детей // Ю.В. Коршакова. — Народная асвета. — 2003. — №12. — С. 62–66.

4. Куліковіч, В.І. Тэхналогія падрыхтоўкі да алімпіяды па беларускай мове і літаратуры / В.І. Куліковіч. — [Электронный ресурс]. — Рэжым доступу: https://drive.google.com/file/d/1Azk9ZBZP6g7cZ6ytTLbwxj5DLdsKRtjx/view. — Дата доступу: 10.05.2024.

5. Мартынкевіч, С.В. Метад мадэлявання тэксту ў лінгваметадычнай сістэме развіцця маўлення / С.В. Мартынкевіч // Аксиологический диапазон художественной литературы: сборник научных статей / Витеб. гос. ун-т ; под науч. ред. В.Ю. Боровко, Е.В. Криквилец. — Витебск: ВГУ имени П.М. Машерова, 2020. — С. 152–155.

*Дата поступления в редакцию: 17.05.2024*

# СИСТЕМА РАБОТЫ С ВЫСОКОМОТИВИРОВАННЫМИ УЧАЩИМИСЯ ПО ХИМИИ В КОНТЕКСТЕ ДОПРОФИЛЬНОЙ ПОДГОТОВКИ И ПРОФИЛЬНОГО ОБУЧЕНИЯ

*Кежа Светлана Валерьевна*

***Аннотация.*** *В данной статье приводится система работы с высокомотивированными учащимися по химии в контексте допрофильной подготовки и профильного обучения УО «Полоцкая государственная гимназия №2».*

Обучение одаренных детей — наиболее привлекательная сторона учительского труда. Одна из задач, стоящих перед учителем, — это своевременное выявление талантливых и одаренных учащихся, создание условий для оптимального развития их способностей, определяющихся не только хорошим владением терминологического аппарата, умением пользоваться компьютером, но и абстрактно мыслить, мгновенно принимать решения и, что самое главное, проявлять интерес к изучению вещества, его строению, а также превращениям в химических реакциях.

Выявление одаренного ребенка еще не означает, что он тут же начнет увлекаться химией. Привлечь ученика к более глубокому и серьезному изучению предмета можно, если увлечь его и вызвать желание познавать мир через изучение своего предмета. Эффективность допрофильной подготовки обеспечивается организацией работы с высокомотивированными и склонными к углубленному изучению химии учащимися.

Учитель-предметник должен уметь показать ученикам процесс развития науки. Для этого в учебном процессе мы постоянно опираемся на самые интересные факты из истории химии, информируем учащихся о ее современных достижениях, тем самым привлекая ученика к постоянному чтению научно-популярной литературы. Важно показать ребенку, что в химии нет окончательных истин, поэтому в будущем он может участвовать в решении стоящих перед наукой проблем. Такая уверенность способствует повышению мотивации к самостоятельному изучению химической науки. Тем более что одних знаний учителя как источника информации для учащихся недостаточно.

Предлагаем алгоритм организации работы с учащимися на этапе допрофильной подготовки:

1) изучение методических рекомендаций, соответствующей литературы и образцов опыта по работе с одаренными учащимися;

2) диагностика и выявление одаренных детей;

3) разъяснительная работа с учащимися и их ро-